# СМУТАК У КОЖНЫМ СЭРЦЫ

**ІМЯ ЛЕАНІДА ІЛЬІЧА БРЭЖНЕВА — ВЕРНАГА ПРАДАЎЖАЛЬНІКА ВЯЛІКАЙ ЛЕНІНСКАЙ СПРАВЫ, ПАЛЫМЯНАГА ЗМАГАРА ЗА МІР І КАМУНІЗМ — БУДЗЕ ЗАЎСЁДЫ ЖЫЦЬ У СЭРЦАХ ЛЮДЗЕЙ І ЎСЯГО ПРАГРЭСІЎНАГА ЧАЛАВЕЦТВА.**

Бязмежная журба агарнула ўвесь шматтысячны калектыў нашага універсітэта пасля паведамлення аб раптоўнай смерці вернага прадаўжальніка вялікай справы Леніна, палымянага патрыёта, выдатнага барацьбіта за мір і камунізм Генеральнага сакратара ЦК КПСС, Старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР Леаніда Ільіча Брэжнева. Не хочацца верыць, што абарвалася жыццё буйнейшага палітычнага і дзяржаўнага дзеяча сучаснасці.

Пазаўчора студэнты і выкладчыкі матэматычнага факультэта сабраліся ў аўдыторыі 3-1. Ва ўсіх — засмучаныя твары.

Жалобны мітынг адкрыў сакратар парткома М. І. Старавойтаў. Ён сказаў, што Камуністычную партыю, увесь савецкі народ, прагрэсіўнае чалавецтва свету напаткала вялікае гора — памёр выдатны кіраўнік Камуністычнай партыі і Савецкай дзяржавы, буйнейшы палітычны дзеяч сучаснасці, дарагі ўсім нам Леанід Ільіч Брэжнеў. Перастала біцца сэрца камуніста, усё жыццё якога было прысвечана служэнню народу.

Аб яркіх старонках жыцця і дзейнасці Леаніда Ільіча Брэжнева расказаў сакратар партыйнага бюро матэматычнага факультэта Л. Я. Палякоў.

Выступае студэнтка другога курса сакратар камсамольскага бюро факультэта Марына Леўшунова. Яна гаворыць аб вялікіх бацькоўскіх клопатах, якія праяўляў дарагі Леанід Ільіч аб савецкай моладзі, студэнцтве.

Як клятва ўсіх прысутных на мітынгу прагучалі словы першакурсніка Уладзіміра Буракоўскага быць вернымі наказам дарагога Л. І. Брэжнева, настойліва авалодваць ведамі, праяўляць высокую працоўную і грамадскую актыўнасць, выхоўваць з сябе дастойных прадаўжальнікаў справы, якой Леанід Ільіч прысвяціў усё сваё жыццё.

Учора раніцай на жалобны мітынг сабраліся ў актавай зале студэнты і выкладчыкі гісторыка-філалагічнага, біялагічнага, фізічнага, геалагічнага і іншых факультэтаў універсітэта. У панурых тварах — глыбокае перажыванне за вялікую страту. Боллю шчымяць сэрцы ад раптоўнай смерці вялікага сына Краіны Саветаў, паслядоўнага прадаўжальніка справы У. І. Леніна, Генеральнага сакратара ЦК КПСС, Старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР Леаніда Ільіча Брэжнева.

Уступным словам жалобны мітынг адкрыў сакратар парткома М. І. Старавойтаў.

Пра выдатны жыццёвы шлях Леаніда Ільіча Брэжнева, яго шматгадовую працу на пасадзе кіраўніка Камуністычнай партыі і Савецкай дзяржавы гаварыў прарэктар па вучэбнай рабоце член-карэспандэнт АН БССР Л. А. Шамяткоў.

Аб тым, што савецкая моладзь заўжды будзе ўдзячная дарагому Леаніду Ільічу за праяўляемыя аб ёй клопаты, будзе ва ўсіх сваіх справах раўняцца на яго, заначыла ў сваім выступленні студэнтка 4-га курса, намеснік сакратара камсамольскага бюро фізічнага факультэта Святлана Курылкіна.

Хвалююча гаварыў пра Леаніда Ільіча Брэжнева член КПСС з 1929 года загадчык кафедры батанікі і фізіялогіі раслін прафесар Ф. М. Харытановіч. Ён падкрэсліў, што ўсе важнейшыя падзеі ў нашай краіне цесна звязаны з жыццём і кіпучай дзейнасцю Леаніда Ільіча Брэжнева.

Як удзельнік Вялікай Айчыннай вайны з цяжкім болем у сэрцы гаварыў пра Л. І. Брэжнева загадчык кафедры беларускай мовы заслужаны дзеяч навукі БССР прафесар У. В. Анічэнка. З першага і да апошняга дня вайны Леанід Ільіч знаходзіўся на пярэднім краі барацьбы з фашызмам, паказаў узоры мужнасці і стойкасці.

Са словамі вялікай жалобы ад цяжкай утраты на мітынгу выступілі таксама студэнт 3-га курса гістфіла, купалаўскі стыпендыят Іван Афанасьеў і старшыня прафбюро гістфіла чацвёртакурсніца Таццяна Котава.

На жалобным мітынгу прысутнічалі рэктар універсітэта акадэмік АН БССР Б. В. Бокуць, прарэктары прафесар М. В. Навучыцель, дацэнт А. І. Балтоўскі, старшыні прафкомаў М. Н. Мурашка і Н. І. Колтышава.



НА ЗДЫМКУ: удзельнікі жалобнага мітынгу, які адбыўся ў актавай зале ГДУ.
Фота К. Дзмітэркі.

# ПРАЦАВАЦЬ У КАНТАКЦЕ

Кіруючая роля Камуністычнай партыі Савецкага Саюза ў вырашэнні задач камуністычнага будаўніцтва з кожным годам узрастае. Зразумела, павінна ўзрастаць і роля камсамола ў камуністычным выхаванні моладзі. Час патрабуе ад нас вялікай і самаадданай работы, барацьбы за тое, каб у сэрцах маладога пакалення гарэў агонь Вялікага Кастрычніка.

Мінуў амаль год з таго часу, калі адбылася справаздачна-выбарная канферэнцыя камсамольскай арганізацыі ГДУ. Новым саставам камітэта камсамола праведзена пэўная работа. Але вырашыць усе пытанні якаснага пералому, пераходу на больш высокую ступень палітыка-арганізатарскай работы нам пакуль што не зусім удаецца, хаця да гэтага мы пастаянна імкнемся. Для ўдасканальвання ўсёй нашай работы, павышэння ідэйна-палітычнай актыўнасці студэнцтва, на думку камітэта камсамола, ва універсітэце ёсць неабходныя рэзервы і магчымасці. Каб з поспехам і поўнасцю іх выкарыстоўваць, нам неабходна працаваць у цесным кантакце з кафедрамі, грамадскімі арганізацыямі ГДУ.

Ва універсітэце — вялікі навуковы і педагагічны патэнцыял. У нас працуюць сотні вопытных педагогаў, вучоных. Яны ў стане дапамагчы камітэту камсамола ў выпрацоўцы навукова-абгрунтаванай сістэмы ў камсамольскай рабоце. Для нас гэта задача першаступеннай важнасці, таму што вырашаць пытанні камуністычнага выхавання з кожным годам усё складаней.

Канкрэтная дапамога нам была патрэбна ад кафедры філасофіі ў правядзенні сацыяльнага даследавання «Лад жыцця студэнта». Работа гэта вельмі неабходная, таму што ў нас ёсць так званыя актыўныя і пасіўныя студэнты, якія па-рознаму думаюць, маюць розныя інтарэсы і запытанні, і якія неаднолькава адносяцца да грамадскай работы. Адны лічаць, што яна неабходна і грамадству, і чалавеку. На думку іншых — гэта справа патрэбная, але на яе няма часу. Трэція ж думаюць, што грамадскай работай займацца неабавязкова. Ёсць, на жаль, і такія студэнты, якія гавораць, што ёй займацца няма сэнсу, таму што яна нікому не патрэбна. Вось чаму нам вельмі неабходны былі канкрэтныя практычныя рэкамендацыі па рабоце з рознымі катэгорыямі студэнтаў. На просьбу камітэта камсамола адгукнуліся выкладчыкі кафедры філасофіі: сумесна распрацавана анкета сацыялагічнага даследавання «Лад жыцця студэнта», якая распаўсюджваецца на факультэтах.

Чакаем мы дапамогі, канкрэтных дзеянняў і ад кафедр гісторыі КПСС, гісторыі СССР і ўсеагульнай гісторыі ў стварэнні летапісу народнай славы Цэнтральнага раёна. Гэтую важную і пачэсную справу распачалі студэнты гісторыка-філалагічнага факультэта ў мінулым навучальным годзе. Зроблена нямала. Сабраны цікавыя матэрыялы аб падпольнай дзейнасці камуністаў і камсамольцаў горада ў гады Вялікай Айчыннай вайны, аб гісторыі двух буйнейшых прадпрыемстваў Цэнтральнага раёна г. Гомеля — завода вымяральных прыбораў і кандытарскай фабрыкі «Спартак». Каб працягваць далей карысную справу напісання летапісу, якая як святая рэліквія застанецца нашчадкам, студэнтам-энтузіястам неабходна ўсямерная падтрымка названых кафедр, якія б сталі курыраваць іх работу.

Самую сур'ёзную ўвагу ўдзяляе камітэт камсамола шэфскай рабоце. Хаця універсітэт рыхтуе ў асноўным будучых педагогаў, многія са студэнтаў, якім давядзецца пасля заканчэння вучобы працаваць у школах, маюць не зусім канкрэтнае ўяўленне аб рабоце настаўніка. Таму мы ставілі сваёй задачай даваць студэнтам магчымасць знаёміцца з іх будучай прафесіяй непасрэдна ў школах горада. Поўнасцю апраўдала сябе такая форма работы, як стварэнне педагагічнага атрада са слухачоў падрыхтоўчага аддзялення, студэнтаў, які стаў працаваць у СШ № 21 г. Гомеля. У рабят з'явілася цікавасць да работы педагога, жаданне паспрабаваць працаваць у школе самім. Цяпер педатрад працуе цікава, з агеньчыкам. І што важна: дасягнута галоўнае — ужо цяпер, на другім курсе студэнты, якія ўваходзяць у педатрад, жадаюць пасля працаваць менавіта ў школу. Мы спадзяемся на дапамогу кафедры педагогікі і псіхалогіі ў справе перабудовы гэтай работы на сапраўды навуковай аснове. Навукова-абгрунтаваная дзейнасць па прафесіянальнай арыентацыі студэнтаў павінна быць у полі зроку не толькі камітэта камсамола. За педатрадамі трэба замацаваць кансультантаў з кафедры педагогікі і псіхалогіі.

Калі мы будзем працаваць у цесным кантакце з грамадскімі кафедрамі, і яны пачнуць адгукацца на нашы прапановы, аказваць нам пасільную дапамогу, узрасце эфектыўнасць нашай сумеснай работы па камуністычнаму выхаванню студэнцкай моладзі.

**С. АЎСЕЕНКА,**
*сакратар камітэта камсамола ГДУ.*

# РЫХТАВАЦЬ ПАТРЭБНЫХ СПЕЦЫЯЛІСТАЎ

Навукова-тэхнічная рэвалюцыя паставіла перад вышэйшай школай краіны задачу няўхільнага павышэння якасці падрыхтоўкі спецыялістаў, глыбокага вывучэння іх патрэбнасці для розных галін. Не выпадкова на чарговае пасяджэнне партыйнага камітэта універсітэта было вынесена пытанне «Аб рабоце дэканатаў і партыйных бюро эканамічнага, геалагічнага і матэматычнага факультэтаў па забеспячэнню якаснай падрыхтоўкі спецыялістаў для народнай гаспадаркі». Заслуханы даклады дэканаў І. П. Трацэўскага, А. П. Пінчука, У. Ф. Філіпцова. Выступілі некаторыя загадчыкі кафедр названых факультэтаў, а таксама прарэктар па вучэбнай рабоце Л. А. Шамяткоў і сакратар парткома М. І. Старавойтаў.

На пасяджэнні парткома адзначана, што на факультэтах яшчэ недастаткова вывучаецца попыт на спецыялістаў універсітэцкага профілю, не наладжаны цесныя сувязі з тымі прадпрыемствамі, арганізацыямі і ўстановамі, куды выпускнікі ГДУ накіроўваюцца на працу. Гэта пытанне вырашана ўзяць пад строгі кантроль рэктарата і парткома. Факультэтам рэкамендавана на аснове дагавораў з міністэрствамі і ведамствамі распрацаваць планы падрыхтоўкі спецыялістаў на перыяд да 1990 года.

# СТАНЬ МАЙСТРАМ СЛОВА

Сённяшні студэнт — гэта заўтрашні малады спецыяліст. У самастойнай працоўнай дзейнасці яму спатрэбяцца не толькі прафесіянальныя веды. Жыццё будзе патрабаваць ад яго і ўменне быць арганізатарам у калектыве, выступіць перад любой аўдыторыяй... Набываць такія навыкі дапамагаюць студэнтам універсітэта заняткі па розных аддзяленнях факультэта грамадскіх прафесій. Ён дае магчымасць юнакам і дзяўчатам разам з асноўнай набываць другую прафесію — грамадскую. Вось яна і дапаможа будучым стаць маладому спецыялісту актыўным удзельнікам грамадскага жыцця.

Умець валодаць словам, даходліва і пераканаўча выступаць перад людзьмі вучыць студэнтаў адно з падраздзяленняў ФГП універсітэта — Школа маладога лектара. Нядаўна адбыліся першыя ў гэтым навучальным годзе сумесныя заняткі слухачоў ШМЛ, будучых палітінфарматараў, прапагандыстаў. Яны праходзілі ў зале Дома палітасветы абкома КПБ. Іх адкрыў дэкан факультэта грамадскіх прафесій выкладчык кафедры палітэканоміі А. І. Канашэвіч. Ён гаварыў студэнтам аб важнасці і значнасці жывога слова лектара, прапагандыста, мастацтве зносін выступаючага з аўдыторыяй.

Кансультант Дома палітасветы В. У. Сідорка, які на працягу года будзе выкладаць студэнтам спецкурс «Павышэнне эфектыўнасці прапаганды», пазнаёміў прысутных з методыкай правядзення заняткаў; прывёў прыклады творчых адносін да лектарскай, прапагандысцкай работы ў некаторых калектывах прадпрыемстваў, калгасаў і саўгасаў вобласці, расказаў аб ролі тэхнічных сродкаў прапаганды.

На занятках дэманстраваўся дакументальны кінафільм «Надзейныя памочнікі прапагандыста».

(Наш кар.).

# У АВАНГАРДЗЕ НАВУКОВА-ТЭХНІЧНАГА ПРАГРЭСУ

**Гутарка з вучоным сакратаром Камітэта па Ленінскіх і Дзяржаўных прэміях СССР у галіне навукі і тэхнікі пры Савеце Міністраў СССР доктарам тэхнічных навук У. М. ЧАЦВЕРЫКОВЫМ**

У працоўныя **дасягненні, якія** азнаменавалі год 60-годдзя ўтварэння СССР, **важкі ўклад** уносяць савецкія вучоныя і спецыялісты. Актыўна ўдзельнічаючы ў выкананні заданняў Камуністычнай партыі і Савецкага ўрада, яны даследуюць прасторы Сусвету і глыбінную будову матэрыі, распрацоўваюць навуковыя асновы прагрэсіўных тэхналагічных працэсаў, новых машын, абсталявання і прыбораў, ствараюць новыя метады дыягностыкі і лячэння захворванняў, асвойваюць радовішчы карысных выкапняў, садзейнічаюць пераводу галін народнай гаспадаркі на шлях інтэнсіўнага развіцця. Найбольш яркія і значныя работы такога характару названы ў пастанове партыі і ўрада аб прысуджэнні Дзяржаўных прэмій СССР за 1982 год, апублікаванай напярэдадні святкавання 65-й гадавіны Вялікага Кастрычніка. Іх аўтары — прадстаўнікі Масквы, Ленінграда, многіх брацкіх рэспублік — РСФСР, Украіны, Беларусі, Узбекістана, Казахстана, Азербайджана, **Латвіі, Таджыкістана** і іншых.

Спіс лаўрэатаў па традыцыі адкрываюць аўтары работ у галіне фізіка-матэматычных навук. Сярод іх — маскоўскія і ленінградскія вучоныя — стваральнікі высокадакладнай тэорыі руху ўнутраных планет Сонечнай сістэмы — Меркурыя, Венеры, Зямлі, Марса. Акрамя вялікай навуковай каштоўнасці, гэта работа з'яўляецца важнай пры вырашэнні задач міжпланетных касмічных палётаў.

Важкімі вынікамі даследаванняў узбагаціла фізічную навуку група вучоных Масквы, Ленінграда і Свярдлоўска, якія адкрылі і даследавалі новы стан цвёрдага цела — бясшчылінны, што ўзнікае пад дзеяннем магнітных палёў, ціску і некаторых іншых фактараў.

Цяжка пераацаніць значэнне для біясферы нашай планеты навуковых асноў прагназіравання сонечных успышак. Яны закладзены калектывам даследчыкаў з Масквы і Ленінграда, выканаўшых вялікі цыкл даследаванняў па дынаміцы токавых слаёў і сонечнай актыўнасці.

Выдатным дасягненнем сучаснай фізікі стала адкрыццё галаграфіі — прынцыпу запісу, узнаўлення і апрацоўкі інфармацыі, закадзіраванай у хвалевым полі. Ён паслужыў імпульсам для развіцця новых напрамкаў у оптыцы, квантавай электроніцы, тэорыі інфармацыі іншых. Цыкл буйных работ «Фізічныя асновы дынамічнай галаграфіі і новыя метады пераўтварэння прасторавай структуры светавых пучкоў», удастоены Дзяржаўнай прэміі СССР, па праву можна назваць новай вяхой у развіцці фізічнай оптыкі, якая мае вялікія перспектывы практычнага прымянення. Аўтары гэтай калектыўнай працы — вучоныя Масквы, Ленінграда, Кіева, Мінска і Казані.

Важкім дасягненнем у галіне прыкладной механікі і матэрыялазнаўства з'яўляецца капітальная манаграфія ўкраінскіх вучоных, прысвечаная праблеме трываласці матэрыялаў і канструкцый у экстрэмальных умовах.

Істотным укладам у вырашэнне праблем геафізікі, акустыкі і механікі трэба лічыць арыгінальныя метады тэорыі распаўсюджвання сейсмічных хваляў. Іх аўтары — ленінградскія і сібірскія вучоныя — сталі лаўрэатамі Дзяржаўнай прэміі.

Усё глыбей пранікае чалавек у зямныя глыбіні ў пошуках карысных выкапняў. Работа гэта па складанасці параўнальная з асваеннем касмічнай прасторы. Вызначальнае месца пры пошуку і разведцы радовішчаў належыць геафізічным метадам даследавання глыбокіх і **звышглыбокіх свідравін.** Гэта задача запатрабавала стварэння прынцыпова новых геафізічных метадаў вывучэння геалагічных асяроддзяў, пры якім метал абсадных труб свідравіны — не перашкода. Распрацоўка фізічных асноў такіх метадаў і тэхнікі з выкарыстаннем патокаў нейтронаў або гукавой энергіі — сутнасць узнагароджанай работы, выкананай сумесна **некалькімі інстытутамі Акадэміі навук СССР, Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі,** Мінгазпрома і іншых ведамстваў.

Дзяржаўная прэмія СССР прысуджана групе вучоных, канструктараў і работнікаў вытворчасці з арганізацый Акадэміі навук за стварэнне і ўкараненне прэцызійных прыбораў для мікрахірургіі, вымярэння электрычных характарыстык **жывой клеткі.**

Да буйных фундаментальных даследаванняў адносіцца работа групы маскоўскіх вучоных, якія правялі цыкл работ па структуры і генетыцы аднаго з важнейшых ферментаў жывой клеткі РНК-полімеразы. Вывучаны і іншыя яго важнейшыя ўласцівасці. Атрыманыя вынікі пакладзены ў аснову новага фундаментальнага навуковага напрамку.

Сярод **узнагароджаных — капітальныя працы прадстаўнікоў гуманітарных навук** — «Нарысы рускай культуры XIII—XVII стагоддзяў», «Руская граматыка», «Гісторыя сацыялістычнай эканомікі СССР».

Лаўрэатамі Дзяржаўных прэмій СССР сталі аўтары некалькіх работ у галіне медыцыны. Сярод іх — калектыў, які выканаў цыкл даследаванняў па геаграфічнай паталогіі і эпідэміялогіі сардэчна-сасудзістых, анкалагічных і нервовых захворванняў.

**Планамерная барацьба з сардэчна-сасудзістымі** захворваннямі немагчыма без **эфектыўных** сродкаў іх дыягностыкі. За дасягненні ў гэтым напрамку ўзнагароджана група вучоных, інжынераў і рабочых, стварыўшых новае пакаленне дыягнастычных прыбораў — поліаналізатараў з убудаванымі вылічальнікамі.

У спісе лаўрэатаў — спецыялісты, якія распрацавалі і ўкаранілі ў практыку аховы здароўя арыгінальныя апараты з мэтай вывучэння хворых з прыроджанымі анамаліямі нырак і мачавых шляхоў; аўтары работ па вывучэнню зменлівасці ўзбуджальніка туберкулёзу ў працэсе хіміятэрапіі, вучоныя, якія прапанавалі арыгінальныя метады мікрахірургіі пры траўматычнай ампутацыі пальцаў і кісці рукі.

Прэміяй адзначан рад работ па рэалізацыі буйных навукова-тэхнічных праграм, перабудове вытворчасці і кіравання на аснове выкарыстання навейшай тэхнікі і тэхналогіі, павышэнню якасці выпускаемай прадукцыі.

Важнейшыя задачы вучоных, спецыялістаў, работнікаў вытворчасці — усямернае садзейнічане павышэнню прадукцыйнасці працы, зніжэнню сабекошту і павышэнню якасці прадукцыі, эканомія энергіі, сыравіны і матэрыялаў. Гэтыя задачы вырашаны аўтарамі і іншых узнагароджаных работ у галіне тэхнікі.

Лаўрэатамі сталі стваральнікі арыгінальных аўтаматызаваных шарапракатных станаў, сямейства ЭВМ «Электроніка»; спецыялісты, распрацаваўшыя і ўкаранілі ў практыку дыяганальныя паваротна-лопасныя гідратурбіны, якія не маюць сабе роўных у свеце па тэхніка-эканамічных паказчыках. Можна адзначыць таксама поспех калектыву, які прапанаваў і ўкараніў навукова-тэхнічныя рашэнні для паскоранага стварэння буйнога Шатлыкскага газавага комплексу, стаўшага асноўным пастаўшчыком газу для газаправода Сярэдняя Азія — Цэнтр; аўтараў даследаванняў уласцівасцей металургічных расплаваў, а таксама — навуковых асноў стварэння даўгавечнага марозаўстойлівага бетону для транспартнага і гідратэхнічнага будаўніцтва і іншых. У спісе лаўрэатаў — аўтары трох падручнікаў для ВНУ і падручніка для прафесіянальна-тэхнічных навучальных устаноў.

(ТАСС).

# ТЭЛЕБАЧАННЕ — У СТУДЭНЦКАЙ АЎДЫТОРЫІ







Сёння тэлебачанне трывала ўвайшло ў наша жыццё. Але не толькі як невычэрпная крыніца інфармацыі аб важнейшых падзеях у нашай краіне і за мяжой. Яно зрабіла вялікі крок наперад і ў іншым напрамку: стала неабходным пры правядзенні некаторых тэхналагічных працэсаў у цэхах прадпрыемстваў, у час складаных аперацый у медыцыне... Пералічыць усе сферы яго прымянення наогул нялёгка — так пашырыла тэлебачанне свае межы. Прыйшло яно і ў **студэнцкія аўдыторыі,** каб дапамагчы лепш засвойваць пэўныя дысцыпліны вузаўскай праграмы.

Нядаўна пачаў дзейнічаць студэнцкі тэлевізійны цэнтр і ў нашым універсітэце. Ён размясціўся на трэцім паверсе галоўнага корпуса. Трэба адзначыць, што не кожная навучальная ўстанова рэспублікі мае такое важнае вучэбнае падраздзяленне як тэлебачанне. Падрыхтоўка тэлецэнтра да пуску — працэс доўгі, вельмі складаны, працаёмкі. Таму абысціся ў гэтай справе толькі сіламі яго работнікаў — загадчыка лабараторыі вучэбнага тэлебачання **ГДУ З. Б. Айгарса, інжынера М. І. Навасельскага, аператара В. М. Шынкарэнкі,** рэжысёра С. Семянцовай было, безумоўна, нялёгка. Тэлецэнтр ствараўся пры дапамозе саміх студэнтаў. У асноўным гэта былі студэнты групы Ф-41 (цяпер ужо Ф-51) фізічнага факультэта. А самы важкі ўклад у правядзенне мантажу і ўстаноўку тэхналагічнага абсталявання ўнеслі Д. Падабед, У. Жыгар, А. Масцярскі і іншыя рабяты гэтай групы.

Студэнцкі тэлевізійны цэнтр укамплектаваны «сваімі» кадрамі — сёлетнімі выпускнікамі універсітэта. Інжынер ТБ — былы студэнт матэматычнага факультэта Мікалай Навасельскі, рэжысёр — выпускніца фізфака Святлана Семянцова, завочна вучыцца ў ГДУ аператар Валерый Шынкарэнка. Кіруе работай лабараторыі вучэбнага тэлебачання вопытны спецыяліст З. Б. Айгарс.

Самыя першыя заняткі ў тэлевізаванай аўдыторыі 3-1 прайшлі ў студэнтаў другога курса эканамічнага факультэта аддзялення АМАЭІ.

...На экранах тэлевізараў, якія ўстаноўлены ў аўдыторыі, статыстычны матэрыял: графікі, схемы, дыяграмы... Раней выкладчыку даводзілася або самому чарціць іх на аўдыторнай дошцы ў час лекцыі, ці прыносіць іх на заняткі ў выглядзе плакатаў. Цяпер гэта рабіць непатрэбна. Яму варта націснуць на адпаведную кнопку на апаратуры, якая звязвае аўдыторыю са студыяй — аператарам, пультам рэжысёра — і сказаць, які матэрыял паказаць студэнтам на экранах тэлевізараў. Астатняе — справа тэхнікі. Проста, зручна і хутка. А вучэбны працэс становіцца інфармацыйна багацейшым.

Зразумела, што адной тэлевізійнай аўдыторыі для правядзення ў ёй заняткаў студэнтаў іншых факультэтаў недастаткова. Таму работнікамі лабараторыі вучэбнага ТБ вядзецца ўстаноўка адпаведнай апаратуры ў адной з аўдыторый другога корпуса універсітэта. Плануецца тэлевізаваць таксама **яшчэ некалькі аўдыторый галоўнага корпуса. Тады па сістэме вучэбнага тэлебачання змогуць займацца студэнты фізічнага,** біялагічнага факультэтаў, факультэта фізвыхавання.

Пачатак зроблены. Але на **гэтым** вучэбнае тэлебачанне **ГДУ не спыніцца.** Да новага **навучальнага** года **плануецца пуск участка відыёзапісу і кіно.** Будзе створана відыётэка — **наглядны матэрыял,** якім **зможа** карыстацца любы выкладчык на сваіх занятках. **Будучыя фізікі,** напрыклад, атрымаюць магчымасць убачыць наглядна, а не ўяўляць сабе з тлумачэнняў выкладчыка, складанейшыя фізічныя працэсы, эканамісты — падрабязна прааналізаваць адзняты на відыёстужку вытворчы працэс на прадпрыемстве (хранаметрыраванне рабочага часу і г. д.).

Магчымасці, якія адкрывае тэлебачанне ў вучэбным працэсе, вялікія. І выкарыстоўваць іх трэба ў поўнай меры. Карысць ад гэтага будзе відавочная.

**Т. ДУБЯК.**

**НА ЗДЫМКАХ: 1. С. Семянцова за пультам рэжысёра. 2. Загадчык лабараторыі вучэбнага тэлебачання З. Б. Айгарс праводзіць азнаямленчыя тэлевізійныя заняткі са студэнтамі-другакурснікамі эканамічнага факультэта аддзялення АМАЭІ. 3. У студыі вучэбнага тэлебачання ў час тэлевізаванай лекцыі.**

Фота К. Дзмітэркі.

